# Пачынаецца год з духоўнасці



*Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка віншуе пісьменніка Анатоля Статкевіча-Чабаганава.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Пяць прэмій Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі «За духоўнае адраджэнне» і дзесяць спецыяльных прэмій Кіраўніка дзяржавы сталіся годнай ацэнкай дзейнасці святароў, педагогаў, супрацоўнікаў дабрачынных арганізацый, аўтарскіх ды працоўных калектываў. Па традыцыі ўручаюцца ўзнагароды ў калядныя дні, асветленыя радасцю, шчырасцю і цеплынёй.**

**(Заканчэнне на стар. 2.)**

# Пачынаецца год з духоўнасці

(Заканчэнне.
Пачатак на стар. 1.)

У ліку лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне» — аўтарскі калектыў архітэктараў-рэстаўратараў, якія распрацавалі праект рэстаўрацыі дварцова-паркавага ансамбля ў Нясвіжы; дырэктар Радашковіцкай школы-інтэрната для дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, Ігар Дзятлоўскі; ігумення Свята-Раждзжаства-Багародзічнага стаўрапігійнага жаночага манастыра ў Гродне Беларускай Праваслаўнай Царквы ігумення Гаўрыіла; калектыў Гомельскага абласнога дыягнастычнага медыка-генетычнага цэнтра з кансультацыяй «Шлюб і сям'я»; дырэктар рэлігійнай місіі «Дабрачыннае каталіцкае таварыства "Карытас"» Віцебскай дыяцэзіі Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі Віталь Кульпекша.


Фота БелТА

*Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручае ўзнагароду кіраўніку групы архітэктурнага аддзела № 1 Праектрэстаўрацыі Святлане Краюшкінай.*

На святочную сцэну ўзнімаліся таксама і лаўрэаты спецыяльнай прэміі Кіраўніка дзяржавы, уганараваныя за значныя дасягненні ў розных галінах мастацтва. Трэба заўважыць, што многія работы лаўрэатаў у пэўнай ступені звязаныя з Годам кнігі. І самы, бадай, яркі прыклад — член Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Статкевіч-Чабаганаў, аўтар серыі гісторыка-дакументальных кніг «Я — сын Ваш».

Сярод уганараваных — калектывы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь і Тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» — за яркае сцэнічнае ўвасабленне твораў класікаў беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча і Кандрата Крапівы; калектыў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — за значны ўклад у захаванне і папулярызацыю кніжнай спадчыны, а таксама Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы — за вялікую работу па прапагандзе творчасці народнага Песняра. Прэміяй за працу па адраджэнні рамёстваў, абрадаў і народнага мастацтва рэгіёнаў адзначаны Дрыбінскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей і народны тэатр гумару, гульні і песні «Хмелеўскія валацугі» (Жабінкаўскі раён). Уганараваны калектыў Музея гісторыі горада Мінска, якому належыць стварэнне экспазіцыі Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага.

Высокай узнагародай адзначана праца кінарэжысёра-дакументаліста Галіны Адамовіч па стварэнні фільмаў пра майстроў культуры і спорту ды Альбіны Пякуцькі, загадчыка кафедры харавога і вакальнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па развіцці беларускай школы акадэмічных харавых спеваў.

**Алеся БАЦЮСЬ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ